БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Сэрпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.
Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 69. Менск. Аўторак 18 чэрвеня 1918 г. Год I

АБВЕСТКІ.

аб прыеме уцекачоу у эпідэмічны шпіталь.

§ 1. С прычын вялікай апаскі перэнесення пошэсьці праз пошэсьцныя занядужанні .гэтым пастанауляецца, што толькі старшы лекар эпідэмічнаго шпіталю назначае час выхода хвораго са шпіталю, а так сама разам з ім прынятых яго блізкіх.

Хто без пазвалення выйдзе са шпіталю або возьме аттуль сваіх дзяцей, або жа забярэ памершаго с сямьі, той будзе мець кару грошавым штрафам да 3,000 марак або будзе мець арэшту да 1 года.

§ 2. Пошэсьцнымі хваробамі у стасунку з гэтым загадам лічуцца, чума, холера, проказа, плямісты тыфус, стоубняк, узваротная ліхарадка, малярыя, брушны тыфус, дызынтэрыя, дыфтэрыт, скарлятына, кор, сіфіліс, мякі шанкер, трыпэр, тубекулез, заражэнне трыхінамі, пошэсьныя наскурныя хваробы, шаленства, сыбірская эпідэмія і падазронныя у гэтых хваробах выпадкі.

§ 3. Прыняцце, і харчы ні хворых крэуных, якія хочуць правадзіць дзяцей, можа быць толькі тады пазволено, калі дзеці ні старэй 5 гадоу і калі есьць на гэта належачае пазваленне лагэрнаго лекара.

§ 4. Адведыванне хворых с прычын вялікай апаскі расшырэння пошэсьцных хвароб можэ быць пазволена толькі у выключыцельных выпадках і пазваления глаунаго лекара і толькі ад 3—5 гадзіна папалудні.

Менск, 15 чэрвеня, 1918 году.

Камэндант
НАГЭЛЬ.
Генэрал-лэйтэнант.

Вымагаемыя па загаду Глаунакамандуючаго 10 Армі ад 14 красавіка 1918 г., уістычнасьці опісі сырья і фабрычных выроб, заявы, дзеля мінавэння кар памяненых у § 8 паказанаго загаду павінны быць паданы у Градоначальстве, Падгорная вул. д. 14 пакой 10-ы, ні пазней 28-го чэрвеня 1918 года.

Менск 17 чэрвеня 1918 г.

Нямецкі Градоначальнік
Капітан
ГЕРШЭЛЬ.

Выстаука кніжных друкау

У Гарадзкім тэатры дзеля многіх жаданнеу публікі будзе прадоужэна да 24 чэрвеня і аткрыта штодзенна ад 11 гадзіны з ранку да 7 гадзіны вечара.

Наша зямля.

Ад самаго пач..тку вайны Беларусь зрабілася тым вялікім і пастаянным этапным пунктам, каторы павінен аставіць на сабе значныя сьляды на доугія гады.

Перш-на-перш паласа фронту, стаяушая тут бадай за увесь час вайны зрабіла тое, што зямля скрозь прарыта аконамі, сялепні зніпчаны, і лясы паглумлены без уселякаго толку. Потым прыфрантавы рубеж, дзе адбывалося пастаяннае «переселение народау». —розных ваенных установау атрадау, хваль уцекачоу, аставілі на мейсцох пераходу свой фізычны і духоуны адбітак. Пасьля сконцэнтраванне усей «палітычнай энэргіі большэвіцкіх главарау на «сѣверо-западную область» даверпыло абраз руйнавання.

Хацеушы амярцьвіць беларускі дух праціулення назаусёды, яны думалі правесьці свае нісумленныя камбінацыі у Бярэсьці. Калерным алоукам яны х целі правесьці лініі па мапе беларускай зямлі і гэтым выявіць свой прыгавор сьмерці нізалежнасьці беларускаго нацыянальнаго духа. Але гэты фінал бышай чэрпасоценнай палітыкі абрусення над штандарам «таварышоу» вышоу ні зусім удачным і абарваным на сярэдзіне: лініі гэтыя, дзякуючы жывучасьці беларускаго духа могуць быць сьцертымі і пакрэсаванымі іначэй.

Усьлед за «таварышамі», назапасіушыся алоукамі, пачалі падыходзіць да беларускай мапы і палякі, маючы замер. пры акрэсьліванні конфігурацыі будучай Польшчы вымалеваць сабе на беларускай глебі добры акраец. На жаданні і жадаючых, наогул, німа граніц і і меры. Выходзіць так, нібы у Беларусі знаходзіцца адвечная касса дзеля выплаты страт розным славянскім братом.

Гэтакія пэрспэктывы былі да таго часу, пакуль Беларусь ні падавала сваго голасу. Але с той эры, калі Беларусь аб'явіла сябе нізалежнай—дэкорацыя меняецца, «братнія» алоукі ні могуць так свабодна разгуліваць і скакаць на паперы мапы беларускай—Беларусь ні упусьціць аднаго. кроку роднай зямлі ні пад якім відам, апіраючыся на безтэндэнцыйнасьць ніславянскіх народау і на сваю. бясспорную правату.

Я—р.

Нататкі аб школьнай справе.

II.

На гэты раз, ні габаючы другіх пытанняў, зачэпім толькі пытанне аб грунце для адчынення беларускіх школаў.

Самы жаданы і падатны грунт для гэтаго знойдзем на вёсцы, там, дзе беларуская мова праймае ішчэ усё сялянскае жыцце і чужыя культуры маюць найшчуплейшы ўплыў. Тамака ні толькі вучні, але і самі бацькі з вялікай радасьцю спаткаюць сваю школу. Нізлічаныя прыклады навучання па беларуску, якія рабіліся да гэтых часаў прыватнымі асобамі і у аддзельных школах дазваляюць мець аб гэтым поўную пэўнасьць.

Праўда у гэтай справе Беларускай дзержаві прыдзецца, як і шмат у чым іншым, спатకацца з процi беларускімі нацыяналістычнымі з выгляду, а укрыта-палітычнымі, аннэксіяністскімі па суці, нёкамі, сярод моцна—зрусыфікованных колаў бышаго расійскаго чыноўніцтва і сполонізаваных землеўласьнікаў, але гэта ні меня стану рэчы.

Крыху горэй, магло-б здавацца, стаіць пытанне аб сярэдніх школах, большая часьць якіх да гэтаго часу знайходзілася у буйнейшых местах. Тутака мы павінны лічыцца с тым, што кіруючая роля у моськім жыцці на Беларусі валежыць да нінацыянальных, альбо дэнацыяналізаваных беларускіх элемэнтаў, для якіх думка аб том, што на Беларусі павінна быць і беларуская школа,—думка новая, як ніспадзевана і самая беларуская дзержаўнасьць.

Але гэта толькі магло-б так здавацца. Праўдзівае жыцце паказуе, што і справа сярэдняй школы стаіць ні кепска. Перш за усе рэформа сярэдняй школы, якая даўно ужо вымагалася жыццем нават у Расіі, перарабіць цяперашнія кастовыя вучэльні і зробіць іх меннем усяго народу. Праграмма навукі у сярэдняй школе, якая будзе служыць далейшым разьвіццем программы навукі у нізшай школе, зьвяжа яе з апошняю і вольна-нівольна павінна будзе стацца нацыянальнай праграммай і зрабіць нацыянальнай самую школу, бо у яе з ніжшых школаў дзеці выгадаваныя у нацыянальным духу. Тым чынам рэчы, якія дагэтуль лічыліся глаўнымі у сярэдняй школі: руская мова, руская гісторыя, руская літэратура, самі павінны будуць адыйсьці і стаць на другое мейсцо, заняць адпаведны пляц сярод другіх агульна навуковых рэчаў праграммы.

Разумеецца найменей тут паможа рэволюцыйный спосаб замены старых сыстэм новымі, але мы пэўны, што рэформа сярэдняй школы пойдзе такімі шпаркімі крокамі як толькі умацуецца Беларуская дзержаўнасьць, што гэто будзе лепі усякіх рэвалюцыяў.

Асобна стаіць пытанне аб ні беларускіх школах усіх тыпаў, але аб іх некалі у другі раз.

З. Бядуля.

Агульныя весткі.

ЖЭНЭВА. 11 гм. «Tr. Ztg.» У гадаўшчыну высадкі у Францыі першых амэрыканскіх войск, Пуанкарэ выслаў да Вільсона тэлеграму у якой гавора: Дзержавы згоды пераживаюць цяпер найтруднейшы момэнт вайны, але шпаркае утварэнне новых амэрыканскіх ваенных адзінак і ніперарыўнае павялічэнне амэрыканскіх марскіх транспортаў зьбліжаюць нас да дня у якім нарэшці вернута будзе роўнавага. Калі гэта наступіць на нашу карысьць, тады надыйдзе гадзіна адплаты.

ЛЕНДАН 14 гм. «Reuter» Дзеля аблягчэння перагружанаго працаю «ваеннаго» габінэту пастаноўлено стварыць другі, т. зв. хатні (domes tic) габінэт, які займаецца толькі ўнутрана-палітычнымі справамі.

БЭРН. 13 гм. «Temps» паведамляе, што б. гішпанскі міністр Чэрва у прамове аб намечаных вайсковых рэформах, якую меў у Мадрыдзе, сказаў, што дзякуючы Эўропэйскаму конфлікту канечне трэба, каб Гішпанія была узброена. Прамоўца ні верыць у стварэнне зьвязку народаў.

БУКАРЭШТ. 13 гм. Вольф. Абэцныя цяпер у Букарэшці міністры пад старшынствам Маргіломана устанавілі зьмест троннай прамовы, каторай кароль адчыніць парлямэнт у будучым месяцу. Таке Іонэску і нікаторыя яго палітычныя прыяцелі, як паведамляюць Ясскія газэты, атрымалі дазвалення на выезд за граніцу.

ГАГАА 13 гм. «Reuter» паведамляе, што у адказ на тэлеграму новаго старшыні Коорэманна да Ллойд-Джорджа ен выказаў, так сама тэлеграфно, сваю уфнасьць, што стасункі паміж Англіей і Бэльгіяй будуць зьлітнымі і запэўніў што ангельскі народ мае ніухільны замер аслабаніць Бэльгію ад пануючаго над ёй уціску.

ГААГА. 13 гм. На сусветнай гандлевай конфэрэнцыі

парламэнтскіх дзеячоў коаліцыі, абгаварывалася, як даведзацца «British News» справа агульна коаліцыйнаго гандлёваго дагавору. Далей конфэрэнцыя мае вясьці абгавор справы аб аднастаймым аўтарскім праве і пашпортных правілах у дзержавах коаліцыі і, на астатку справу правядзення тунэля над Па-дэ-Калэ.

АБО. 13 гм. Подлуг сэнатскаго трактату Фінляндзія мае быць нізалежным констытуцыйным каралеўствам з дзедзічнай (спадковай) монархіяй. Кароль можа панаваць тольні у Фінляндзіі і павінен належаць да лютэранскаго касьцелу. Усякія заграпічныя умовы павінны атрымоўваць санкцыю сэйму, а так само ў пытаппя вайны і міру. Члены ураду, адказуюць перад сэймом.

РЫМ. 13 гм. «Ag. Stefani». У адказе на ліст спіскапу ламбардзіі Папа Рымскі ...ведзыў, што ён глыбока засмучаны той кампаніяй якая пачалася проціў яго асобе і яго дзела, зроблено ім усе што было у яго сілах каб прысьпешыць канец вайны і зменьшыць цярпенні. У рожных выпадках ганіў ён усякія праступкі проціў права, нізалежна ад таго дзе яны былі зроблены. Вінавацяць яго, што ён хацеў вайны, ці хацеў ніспраўдлівага міру, карыстнаго тольні для аднэй з ваюючых старон.

Яго словы перакручываюцца, яго мыслі і замяркавання тлумачацца с падайзронасьцю. Нават калі ён маўчыць аб тым ці іншым праступку, то і гэто тлумачыцца з нападкамі

ВЭРН. 13 гм. Подлуг паведамленняў с Парыжу у парламентскіх колах зауважаюць моцны рух у кірунку аддапя ўлады на нова Бріану:

Соцыялісты, патрымоўваючыя гэтую думку ні хочуць адпак браць на сябе у гэтым ініцыатыву, пакуль ні выясвілася сытуацыя на фронце.

БЭРЛІН. 13 гм. Пруская палата разглядала бюджэт міністэрства рэлігій і справы, якія датычуць вышэйшых навуковых закладоў.

Весткі з Расіі.

— **Гаага**. 14 гм. «Вольф». Маскоўскія газэты атрымалі дазваленне на выхад у сьвет на нова, але ім дадзена засьцярога, што падбіванне насялення проціў савецкаго ураду будзе карацца ваенным судом. Цэнтральны Камітэт саветаў заапробоваў рэпрэсіі проціў вялікіх землеуласьнікаў і багатых селян, каторыя хаваюць збожа і другія харчовыя прадукты і пазваляюць ім псавацца. Народным камісарыятам Трэтьяковская галерэя аб'яўлена пацыяналізаванай. З Пецярбургу атрымоўваюцца весткі што тамака с кожным днём ўзмацняецца агітацыя за зварот манархіі.

— **Лендан**. 12 гм. «Reuter» На запытанне Лос Сміта, зробленае у Ніжняй Палаці, ці дайшла да скутку умова паміж Амэрыкай і Коаліцыяй аб ўмешанні у ўнутраныя Расійскія справы і ці прынята пастанова аб аказанні Расіі шырокай эконамічнай помачы, Бальфур сказаў: Вестка аб поўзяці умовы, якая-б выключала інтэрвэнцыю у Расіі ні праўдзівая. Само сабой разумеецца, што хочам шчыра падтрымаць Расію у эконамічным жыцці.

— **Кіеу**. 13 гм. «Кіевск. М.» паведамляе, што гарнізон Масквы мае быць значна павялічаны, дзеля апаскі большэвікоў, што могуць на[ступіць] бунты.

Крэмль могно сьцеражэцца. Яго абарона больш 100 гарматоў і кулямётаў.

Весткі с Польшчы.

З Варшавы паведамляюць што тамака у сераду 12 гм. скончыўся штрайк друкарскіх работнікаў у польскіх газэтах. Газэты мелі на нова выйсьці у чацьвер.

— Рэгенцкая Рада пастановаю ад 23/V назначыла д-ра Ст. Устыяноўскаго таварышам міністра у Міністэрстві ўнутр. спраў і пастановай ад 29/V п. К. Сенькевіча лэфам сэкцыі самаўпраўлення М. Ун. спраў.

— На пасядзэнні юрыдычнай рады пры міністэрстве ўнут. спраў 13 гм. разглядалося пытанне аб скасаванні льгот для жонак запасных.

У Лодзі даецца заўважыць сярод варочаючыхся уцекачоў ні малая лічба даўнейшых рускіх паліцыянтаў і ахрапнікаў. Німільна для палякоў гэтыя госьці свой зварот у «зямлю абецаную» тлумачаць німагчымасьцю для іх жыцця у Расіі.

У Чэнстахове імпэр.-нямецкая почта прыймае лісты у расійскую рэспубліку за вылучэннем Украіны і аддзеленых ад Расіі парубежных панстваў.

З Украіны

— **Кіеу**. 13 гм. Кіеўскія газэты паведамляюць, што міністр заграпічных спраў Дорошэнко передаў нямецкаму паслу гр. Мумму ноту у якой даводзіць ніабходнасьць прылучэння Крыму да Украіны.

— **Кіеу**. 13 гм. Подлуг, тутэйшых газэт перагаворы Украіны з Вялікаросіяй стаяць, так:

Назначэнне дэмаркацыоннай лініі па усіх фронтах даручаецца вайсковым ўладам;

Перагаворы аб граніцах Украіны павінны пачацца заразжа і дзеля таго справа назначэння агульнай дэмаркацыоннай лініі зьнімацца да часу з парадку дня;

У справу аднаўлення таварнай, пачтовай і тэлеграфнай комунікацыі а так само у пытанні аб публічнасьці пленарных пасядзэнняў да згоды ні дойдзено бо дэлегацыя ад Украіны высказалася проціў дапушчэння на пасядзэнні прэдстаўнікоў друку.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Опісь сырья і фабрычных выробак як напрыклад: мэталау—плятыны, хрома, мосеняжу, волава, цынка, ртуці, буры, саснаваго масла, воска, адбросау усякаго рода гумы шэрсьці, нітак, ануч, пэркалевых матэр'ялау, лену, шауку, паперы, нівыробленых скур, выробленых скур і скураных таварау і інш. патрэбна зрабіць асобіста або, праз прэдстауніка у мейсцовую камэндантуру, выключаючы аптэк і рознічнай таргоулі у адчыненых магазінах, якім пазволено сырье у адмежэваным ліку для асобістых патрэб у районе X арміі.

Без гэтаго пазвалення рознічная таргоуля пазваляецца толькі да 30 чэрвеня.

За нарушэнне гэтых пастановау—штраф да 50,000 марак і турма да 5 гадоу.

Усе вышэйсказанае робіцца па загаду глаунакамандуючаго X арміей генэрала фон-Фанкельгэйма.

Пры кладбішчэнскай перэспенскай цэркві, як найболей багатай, проэктуецца павялічэнне прычта, аб чым і пачато группай парахвіян хадатайство перад епархіальнай уласьцю.

Адбыуся навад з гэтай прычыны многалюдны і шумны сход парахвіян і парахвіянскай рады 16 чэрвеня.

Харчавую часьць упраулення Л. Р. ж. д. с прычын ніумеласьці організацыі справы, у хуткім часе бяруць у свае рукі гэрманскія жалезн.д. уласьці.

З Украіны гэтымі днямі прыбывае па адрэсу харчавога упрауленскаго бюро апошняя порція цукру – 9 вагонау.

З жытняй мукою у Слуцкім павеці нічога ні выйшло, бо вельмі дорага хочуць—56 руб. пуд.

Л.-Р. ж. д ад гэткай комбінацыі адмовілася.

Выпуск бон губ. земствам на два мільены рублеу, як паведамляюць зземуправы, мае быць пазволены нямецкімі уласьцямі.

А што тычыцца усьпеха звертання да большэвікоу захадняй вобласьці аб звароце захопленых у казна эйстве вялікіх земскіх сумм, то покуль што нівядома.

Бэрлінская нямецкая опэрэтачная труппа пачне свае гастролі у менскім мест. тэатры ад пачатку будучаго месяца.

У т-ве сельскай гаспадаркі 15 го, 16-го і 17-го чэрвеня адбыуся гадовы агульны сход членау,

Курсы для настаунікау. У ліпню, ці у жніуню ідучаго году Сэкрэтарствам Прасьветы проэктуецца адкрыцце у Менску аднамесячных курсау для настаунікау народных школау для азнаймлення іх з Беларусазнауствам і яго мэтодыкай. Пачынаючы з восені г. г. у Менску маюць істнаваць сталыя курсы (двухгоднія) для падгатоукі настаунікау для пачатковых школау.

У Менску маецца у цяперашні час каля *20 камплектау пачатковых беларускіх ткол*ау. Ад восені магчыма, што адкрыюцца бел. вышэйш.-пачатковыя школы.

Места Менск наогул зрабіло ужо шмат для беларускай школы, чаго ні можна сказаць аб губэрнскім земстві, у якім пануюць і кірують прасьветаю праціуныя беларускай школе элемэнты.

Бібліографія.

«Вольная Беларусь».

№ 20—21, выйшоу з друку 9-го чэрвеня. Зьмест такі: Лірнік, верш А. Гаруна; Дзьве страты, стацця—ь—; Цукравар ні на Беларусі, стацця Р. Земкевіча; Нявольнік, поэма Ф. Чэрнышэвіча; Сон, верш Макара, Стварэнне бусла, легэнда П. Крэчэускаго; Хроніка, дробн. вершы і др.

Цана – 30 кап.

«Дзіцячая Чытанка».

Выданне «Вольн. Бел.» цана—50 кап., кніжка для дзяцей з малюнкамі. Зьмест такі: Дзед і зайчык, верш Я. Коласа; Дзед і мядведзь, верш Я. Коласа; Два браты, верш Ясакара Камар, верш народны; Рак, народная казка; Сіло, апав. Ядвігіна Ш.; Добраноч, (наследаванне); Заяц і жабы, народн.; мядзведзь, народн.; Хлеб, казка Ядв. Ш.; Дудар, казка Т. Гушчы; Да работы, верш.

Кніга мае 32 страніцы. Шрыфт буйны.

АБ УСІМ.

Прароцтвы аб пагодзі.

У «Гомане» № 47 п. Ст. Падберэзскі надрукавау артыкул пад названнем «Прароцтвы аб пагодзе», каторы на працягу 25 гадоу рабіу дасьледы аб зьменах пагоды у нашым краю.

п. Ст. Падберэзскі, тлумачучы у сваім артыкуле „законы атмосфэрычных пераменау", дае вынікі «болей менеи точныя» вось якія:

«Спадзеваная пагода на шэсьць месяцау—ад красавіка да верасьня 1918 году у нашым краю мае быць гэткая:

Красавік: суха, халады; каля 30—прымаразкі.

Май: халодны, вільготны.

Чэрвень: мала цепла; лічэныя гарачыя дні, вільготны крыху дажджу—у меры патрэбы.

Ад **2 ліпня** да **16 жніуня**—благая пагода на 6 тыдняу, з лішкаю вільгаці, мае дзяліцца на тры пэрыоды:

першы двохтыдневы пэрыод ад 2 да 16 ліпня: буры, навальніцы, ветры; спадзеваныя крытычныя дні з навальніцам —каля 2, 6, 11 і 15;

другі двохтыдневы пэрыод ад 17 ліпня да 1 жніуня—бліска ніустанная слата, без навальніцы, без сонца, без ветру;

трэці двохтыдневы пэрыод ад 2 да 16 жніуня, першы тыдзень блізка увесь пагодны, другі—дажджлівы;

Дзень 16 жніуня можна лічыць апошнім днем благой пагоды.

Другая палова жніуня: суха, адзін раз перэпадзе дождж.

Верасень: суха.

«На гэтым канчаецца прароцтва пагоды на памянутыя шэсьць месяцау—ад красавіка да верасьня. Апіраючыся на рэшце агранічэных і ніпэуных данных, я прабую схарактэрызаваць пагоду за два чародныя месяцы: кастрычнік і лістапад 1918 г.:

Кастрычнік—суха, холад.

Каля **2 лістапада**—пачатак зімы; зямля замерзне на суха, без папярэдняе восеннай слаты».

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 14 чэрвеня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Паўднёва-заходней Меррэс і паўночней Бэтэна нам былі адбіты артылерыйскія атакі, у той час, калі вораг уварваўся ў нашыя перадавыя лініі, на другім фронці баевая дзеяльнасьць адможавалася стыкамі разведчыкаў. Артылерыйская дзеяльнасьць ажывілася вечарам паўночней р. Ліс, паўночней Скарпы і па абедзьвым старанам Соммы.

Група арміяу Германскаго Кронпрынца.

Няважныя пяхотныя баі на полі бітвы поўднева-усходней Нуайона.

Паўднёвей р. Эн прадаужалася усіленная баевая дзеяльнасьць. Моцныя націскі французаў на Ломмьер былі намі адбіты контратакай на высату захадней Ломмьера, так сама ніудачна і з вялікімі для ворага стратамі кончылася атака на нашы пазыцыі каля леса Віллер Коттэрэ.

Лейтэнант Мэнкгоф атрымаў сваю 34-ую перамогу у паветры.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

ПАПРАУКА.

У № 68 «Беларускаго Шляху», па тэхнічнаму нідагляду, украліся некалькі абмылак. Папрауляем дзьве найважнейшыя:

Пад артыкулам „*Расцярушанае багацце*" надрукавана подпіс «А. Н.»—павінна быць «А. П.»

У аддзеле «*Весткі с краю*» над весткай „*Рэквізыцыя гумы*" прапушчан загаловак „*Вільня*".

Рэдактар **А. Прушынскі**.

Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынблята.